www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
18/01-25/01/08

**АФІЦЫЙНА**
▪Савет Міністраў Беларусі зацьвердзіў парадак накіраваньня дзяцей на навучаньне й лячэньне за мяжу

**ГРАМАДЗТВА**
▪Колькасьць прозьвішчаў у “чорных” сьпісах павялічваецца

**ПАЛІТЫКА**
▪Рада Эўропы асудзіла Беларусь

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Ці дэмсілы возьмуць удзел у выбарах 2008?

**ЭКАНОМІКА**
▪Беларусы купляюць замала цукру

**КУЛЬТУРА**
▪Гастролі “Свабоднага тэатру" ў Амэрыцы

На пачатку 2008 году ўнутрыпалітычная сытуацыя ў Беларусі стала дапаўняцца фактарамі, ступень уплыву якіх пакуль цяжка прагназаваць зь вялікай ступеньню верагоднасьці. Гэта акцыі пратэсту прадстаўнікоў дробнага бізнэсу, жорсткі прысуд журналісту Аляксандру Зьдзьвіжкову і рост актыўнасьці беларускіх «зялёных», якія выступаюць супраць рашэньня ўладаў наконт паскоранага будаўніцтва АЭС.

**21 студзеня** адстаўкі ўраду «за зьнішчэньне прадпрымальніцтва» запатрабавалі ўдзельнікі акцыі пратэсту, якая прайшла ў Менску. Зь 1 лютага яны паабяцалі распачаць страйк, які, паводле папярэдніх дадзеных, працягнецца месяц. Упершыню пратэстуючыя сталі патрабаваць і адстаўкі «гаранта канстытуцыі» Лукашэнкі. Мабыць, таму ў разгоне дэманстрантаў у гэты раз удзельнічаў асабіста міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў. У чарговы раз пратэстуючых пакаралі арыштамі і судовымі перасьледаваньнямі.

Зноўку сабраўшыся пасьля 10 студзеня на несанкцыянаваны ўладамі мітынг у самым цэнтры сталіцы, больш за тысячу прадстаўнікоў беларускага дробнага бізнэсу заявілі цяпер ужо і пра стварэньне грамадзкага форуму «Ў абарону свабоды прадпрымальніцтва», прызначылі наступную акцыю пратэсту на 18 лютага. Прадпрымальнікі падрыхтавалі звароты ў АБСЭ і ЭЗ з просьбай ацаніць сытуацыю з пазыцыяў сусьветнай практыкі.

Мясцовыя назіральнікі мяркуюць, што, нягледзячы на шматлікія акцыі пратэсту (у тым ліку і ў рэгіёнах краіны), рэжым ня пойдзе на саступкі прадпрымальнікам. У пэрыяд паміж двума апошнімі выступамі прадстаўнікоў дробнага бізнэсу запрашалі на нараду ў адміністрацыю прэзыдэнта (без удзелу самога прэзыдэнта). Паводле водгукаў удзельнікаў, яны сышлі адтуль абсалютна расчараванымі. «Нам распавядалі пра тое, што сваёй дзейнасьцю мы даводзім да галечы айчынную лёгкую прамысловасьць...» – тлумачылі яны. А рэакцыя самога Лукашэнкі выявілася ў заяве пра тое, што нельга дазволіць дэстабілізацыі ў краіне з боку апазыцыі, якая прыкрываецца лёзунгамі пра «нейкую абарону бізнэсу». Пры гэтым ён заўважыў: "Грошы, бізнэсмэны ня любяць плошчаў, гэтага гвалту. А ім (апазыцыі), відавочна, патрэбная гэтая дэстабілізацыя. Мы не дазволім, каб ціхі, спакойны Менск пераўтварыўся ў бурлівы". Зусім не відавочна, што, нягледзячы на цяперашнюю малалікасьць удзельнікаў акцыяў пратэсту, зьнешні спакой сталіцы будзе захоўвацца бясконца. Росту пратэстных настрояў сярод беларускіх грамадзянаў павінен садзейнічаць

сыстэмны крызыс не рэфармаванай эканомікі краіны, якая задыхаецца ад сыстэмы кіраваньня і інвэстыцыйнага голаду.

**18 студзеня** Менскі гарадзкі суд на закрытым паседжаньні прысудзіў былога рэдактара газэты «Згода» Аляксандра Зьдзьвіжкова да трох гадоў пазбаўленьня свабоды ў калёніі ўзмоцненага рэжыму. Ён быў прызнаны вінаватым у зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага ч. 2 арт. 130 (распальваньне расавай, нацыянальнай ці рэлігійнай варожасьці, якое зьдзейсьнена пасадовай асобай з выкарыстаньнем сваіх службовых паўнамоцтваў) Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Крымінальная справа ў дачыненьні да А. Зьдзьвіжкова была ўзбуджаная 22 лютага 2006 году па факце передруку ў газэце «Згода» карыкатураў з дацкай газэты «Jullands-Posten» на прарока Мухамэда. Зыск падаў старшыня рэлігійнага аб'яднаньня «Духоўнае праўленьне мусульманаў Беларусі», які прызнаў, што яго ў гэтым стымулявалі ўлады.

Прысуд А. Зьдзьвіжкову шакаваў ягоных калегаў. Яны ўспрынялі гэтую падзею як акцыю запалохваньня ў свой адрас з боку рэжыму. А некаторыя назіральнікі схільныя ў гэтым жорсткім рашэньні ўладаў бачыць і братэрскі мэсыдж Лукашэнкі, дасланы свайму сябру Ахмадынэжаду. Відавочна, што прысуд журналісту, які не хаваў свайго праваслаўя, можа падштурхнуць да рознага кшталту міжканфэсійных ды іншых дыскусіяў. Прыкметы ажыўленасьці ўжо назіраюцца. Напрыклад, япіскапы чатырох пратэстанцкіх аб'яднаньняў заклікалі беларускія ўлады адмовіцца ад прымусу да ўступленьня ў Беларускую рэспубліканскую піянерскую арганізацыю і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, а таксама спыніць рэкляму акультызму ў СМІ. А падчас сустрэчы 24 студзеня з чальцамі Сыноду Беларускай праваслаўнай царквы Лукашэнка заявіў, што ўзаемадзеяньне дзяржавы і царквы выступае найважнейшым фактарам адзінства беларускага грамадзтва. Лукашэнка ўхваліў намеры Сыноду адчыніць першую ў Беларусі праваслаўную радыёстанцыю. Пра магчымыя сустрэчы прэзыдэнта зь ярархамі іншых рэлігійных канфэсіяў і ягонае стаўленьне да магчымасьцяў працы ў Беларусі мэдыі для неправаслаўных вернікаў пакуль нічога не чуваць.

Паводле афіцыйнай інфармацыі, у 2007 годзе былі зарэгістраваныя «спробы дзейнасьці шэрагу псэўдарэлігійных і дэструктыўных групаў на тэрыторыі Беларусі". Упаўнаважаны па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў указвае на неабходнасьць «узмацненьня барацьбы з псэўдарэлігійнай дзейнасьцю ў рэспубліцы». Ён таксама падкрэсьлівае неабходнасьць «і надалей супрацьдзейнічаць паступленьню на тэрыторыю Беларусі літаратуры і відэаматэрыялаў, якія могуць дэстабілізаваць этнаканфэсійнае становішча ў рэспубліцы».

Паводле дадзеных сацыялягічных дасьледаваньняў, больш за 80% вернікаў у Беларусі зьяўляюцца праваслаўнымі. Варта таксама зазначыць, што зварот калегаў А. Зьдзьвіжкова да кіраўніка Беларускай праваслаўнай царквы мітрапаліта Філарэта з просьбай дапамагчы свайму аднаверцу ў зьмякчэньні прысуду пакуль застаецца без адказу.

Разгортваецца актыўнасьць і вакол будаўніцтва АЭС. Палітыку дзяржавы па будаўніцтве АЭС ухваляюць далёка ня ўсе.

**Зь лютага**, паводле ініцыятывы беларускіх «зялёных» і партыі БНФ, пачнуцца грамадзкія слуханьні, у якіх павінны ўзяць удзел прыхільнікі і праціўнікі будаўніцтва АЭС у Беларусі. Пра свае абяцаньні правесьці ўсенародны рэфэрэндум па гэтым пытаньні Лукашэнка папросту забыўся. На думку шэрагу аналітыкаў, прапагандысцкая кампанія вакол будаўніцтва будзе фактычна кампаніяй за ўмацаваньне пажыцьцёвага прэзыдэнцтва А. Лукашэнкі. Акрамя таго, варта ўзгадаць словы беларускага прэзыдэнта, сказаныя ў 2005 годзе: "Краіны, дзе ёсьць атамныя рэактары, не бамбяць". АЭС зьявіцца палітычнай страхоўкай ад вонкавага ўзьдзеяньня на рэжым. Пры гэтым апалягеты беларускага рэжыму

нярэдка спасылаюцца на незалежную палітыку цяперашняга кіраўніцтва Ірану, які будуе ўласную АЭС у Бушэры.

**Да палітыкі Лукашэнкі** павінны прыцягнуць увагу сусьветнай грамадзкасьці і нядаўнія заявы яго міністра абароны, якія прагучалі з Масквы.

Беларусь разглядае заплянаванае разьмяшчэньне элемэнтаў супрацьракетнай абароны ЗША ва Ўсходняй Эўропе як пагрозу. Пра гэта міністар абароны Беларусі **Леанід Мальцаў** заявіў, выступаючы 19 студзеня ў Маскве на навуковай канфэрэнцыі, прысьвечанай пытаньням забесьпячэньня нацыянальнай бясьпекі Расейскай Фэдэрацыі.

Беларускі міністар абароны лічыць, што разьмяшчэньне элемэнтаў супрацьракетнай абароны ЗША сур'ёзна ўскладніць вайскова-палітычную сытуацыю «каля нашых межаў». Можна зазначыць, што гэтую заяву Леанід Мальцаў зрабіў літаральна напярэдадні першага візыту ў Маскву свайго польскага калегі Радаслава Сікорскага.

Л. Мальцаў таксама прапанаваў наступную навуковую канфэрэнцыю прысьвяціць пытаньням забесьпячэньня вайсковай бясьпекі Саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі, пагрозу якой у Менску бачаць выключна з Захаду.

---

## АФІЦЫЙНА

### Савет Міністраў Беларусі зацьвердзіў парадак накіраваньня дзяцей на навучаньне й лячэньне за мяжу

**Дзеці, якія не дасягнулі 14 гадоў, будуць накіроўвацца на навучаньне за мяжу пры ўмове сумеснага знаходжаньня з законнымі прадстаўнікамі.**

Дзеці-сіроты й дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, могуць быць накіраваныя на навучаньне за мяжу толькі ў тыя ўстановы адукацыі замежнай дзяржавы, якія маюць умовы для іх пражываньня.

Калі дзяцей накіроўваюць на навучаньне на тэрмін больш за 30 каляндарных дзён, неабходны пісьмовы дазвол Міністэрства адукацыі. Калі да 30 дзён – накіраваньне выдае раённы ці абласны камітэт па адукацыі. Пісьмовы дазвол альбо адмову выдаюць на працягу месяца.

## ГРАМАДЗТВА

### Колькасьць прозьвішчаў у "чорных" сьпісах павялічваецца

**Як стала вядома парталу "Беларускі партызан", існуе не адзін сьпіс асобаў, якім часова забаронены выезд за мяжу Беларусі, а прынамсі некалькі "чорных" сьпісаў.**

Напрыклад, у адным зь іх знаходзяцца прозьвішчы каля 100 выбітных навукоўцаў, якія могуць прынесьці карысьць дзяржаве, таму нельга выпускаць іх за мяжу. У іншую базу дадзеных унесены прозьвішчы прыкладна 250 высокіх чыноўнікаў, выезд якіх за мяжу можа адбыцца толькі пры асабістым дазволе прэзыдэнта краіны. Гэта асобы з Адміністрацыі прэзыдэнта, Упраўленьня справамі прэзыдэнта, Савету міністраў, парлямэнту, губэрнатары, дырэктары найбуйнейшых прадпрыемстваў і гэтак далей. Паасобныя міністэрствы й ведамствы таксама рыхтуюць уласныя сьпісы чыноўнікаў, якіх непажадана выпускаць за мяжу.

## ПАЛІТЫКА

### Рада Эўропы асудзіла Беларусь

**Падчас канфэрэнцыі міжнародных пазаўрадавых арганізацыяў Рады Эўропы была прынята рэзалюцыя ў справе Беларусі. У дакумэнце падкрэсьлена занепакоенасьць эўрапейскай супольнасьці парушэньнем правоў чалавека.**

У рэзалюцыі ўзгадваюцца падзеі апошніх тыдняў, калі за кратамі апынулася каля паўсотні чалавек.

Пазаўрадавыя арганізацыі Рады Эўропы заклікаюць беларускія ўлады вызваліць палітзьняволеных, спыніць ціск на дэмакратычных актывістаў ды паважаць правы чалавека.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Ці дэмсілы возьмуць удзел у выбарах 2008?

**Дэмакратычныя сілы возьмуць удзел у парлямэнцкіх выбарах толькі пры выкананьні ўладамі канкрэтных умоваў – заявіў у Страсбурзе Вінцук Вячорка.**

Намесьнік старшыні Партыі БНФ у аўторак выступіў на паседжаньні палітычнай камісіі Парлямэнцкай Асамблеі Рады Эўропы (ПАРЭ), якое прысьвячалася сытуацыі ў Беларусі.

Умовы, якія павінны выканаць беларускія ўлады, – гэта вызваленьне палітвязьняў, рэгістрацыя кандыдатаў ад дэмакратычных партыяў, допуск незалежных назіральнікаў у выбарчыя камісіі.

У сваю чаргу прадстаўніца Савету Рэспублікі Беларусі на паседжаньні ПАРЭ Натальля Андрэйчык заявіла, што беларускія ўлады зацікаўленыя ў дыялёгу з Радай Эўропы, а потым расказала пра "хуліганаў", якія ўсчынаюць бойкі на вуліцах беларускіх гарадоў.

Іншы бок беларускай рэчаіснасьці прадставіў дакладчык ПАРЭ па Беларусі Андрэа Рыгоні, які летась быў у Беларусі, сустракаўся з прадстаўнікамі дэмакратычных сілаў і з уладамі. Таксама выступалі былыя дакладчыкі па Беларусі Андрэс Геркель і Хрыстас Пургурыдас.

Дэмакратычныя сілы на паседжаньні ПАРЭ прадстаўлялі: першы намесьнік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка, намесьнік кіраўніка "Руху за Свабоду" Віктар Карнеенка і адзін зь лідэраў БСД(Г) Алесь Стральцоў.

## ЭКАНОМІКА

### Беларусы купляюць замала цукру

**У мінулым годзе запасы цукру на беларускіх складах у 5,6 раза перавысілі сярэднемесячны аб’ём вытворчасьці. За 2007 год запасы вырасьлі на 20%.**

На складах заляжаліся таксама кансэрвы – іх запасы складаюць 180% сярэднемесячнага аб’ёму вытворчасьці. Але ў параўнаньні з пачаткам мінулага году колькасьць запасаў зьменшылася на адну пятую. Болей за ўсё на складах ляжыць кансэрваў з садавіны й гародніны – 55 млн умоўных слоікаў.

Летась значна павялічылася вытворчасьць вінаградных вінаў і каньяку – у больш чым два разы. На амаль 20% больш выраблена тытунёвых вырабаў.

## КУЛЬТУРА

### Гастролі “Свабоднага тэатру" ў Амэрыцы

**Працягваецца турнэ беларускага “Свабоднага тэатру” па Злучаных Штатах Амэрыкі.**

Пакуль што завершылася нью-ёрская частка турнэ. У Нью-Ёрку трупа паказала 9 спэктакляў. Цяпер артысты адправіліся ў Лос-Анджэлес, дзе прымуць удзел у тэатральным сымпозіюме й пакажуць спэктакаль “Пакаленьне джынс”.

Спэктаклі паказваюцца не на ангельскай мове, з субтытрамі. “На першым паказе

заля была запоўнена на 80%, але пасьля вельмі пахвальнай рэцэнзіі ў выданьні “New York Times” астатнія спэктаклі прайшлі з аншлягам”, – прыводзіць сайт “Хартыя’97” выказваньне кіраўніка тэатру Мікалая Халезіна.

Халезін дадаў, што ім паступала нямала прапаноў застацца за мяжой і там працягваць працу, але трупа не згаджаецца на гэта. “Мы застаемся беларускім тэатрам. Беларускім, і ніякім іншым”, – заявіў кіраўнік “Свабоднага тэатру”.

---

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.